## Святочны канцэрт "Новы год стукаецца ў дзверы"

28 снежня 2021 года ў аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" адбыўся святочны канцэрт "Новы год стукаецца ў дзверы", які падрыхтавалі настаўнікі і вучні ДУА "Ашмянская ДШМ".

Вядучыя мерапрыемства Ёлка (Кацярына Мандрык) і Зіма (Таццяна Чэрская) дапамаглі адчуць казачную атмасферу чакання Новага года. Разам з гледачамі ўспомнілі добрыя традыцыі падрыхтоўкі да свята, спявалі песні, шукалі прадказанні на наступны год, сустракалі Дзеда Мароза (Ілля Сасноўскі), Снягурку (Жанна Грамбовская) і чароўных аленяў (Вікторыя Кліменка і Ангеліна Юхевіч). Сваімі вакальнымі і інструментальнымі нумарамі радавалі наведвальнікаў цэнтра вучаніца Даша Качарга, ансамбль гітарыстаў "Фіеста" (кір. А. Місюкевіч), настаўнікі Алена Лукша, Дар'я Антановіч, Ганна Анюхоўская, Надзея Лукашэвіч, Марына Мяшчановіч.

Мерапрыемства атрымала водгук у сэрцах гледачоў і падарыла добры настрой напярэдадні Новага года.






